## Чамучкі

## (ад 4 да 5 гадоў)

### Тэма Птушкі.

**Расказванне вершаў М. Танка "Галінка і верабей", Л. Геніюш "Верабейка**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, заўважаць выразныя сродкі, разумець змест вершаваных тэкстаў, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Фарміраваць у выхаванцаў пры адказе на пытанні па зместу вершаў навыкі звязнага дыялагічнага маўлення.

**Матэрыял:** карцінка «Птушкі»

Ход

- Паглядзіце на малюнак. Знайдзіце на ім вераб'я. Растлумачце, як вы здагадаліся, што гэта верабейка?

- Паслухайце вершык пра верабейчыка.

**Верабейка**

Верабейка:

- Ціў-ціў-ціў!—

Муху дзюбаю злавіў.

А таму, што ён быў добры,

То з сябрамі падзяліў.

Елі муху ўсе са смакам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шчабяталі:

-- Дзякуй!

-- Дзякуй!

*Л. Генію*ш

- Каго злавіў верабейка сваёю дзюбаю?

- З кім падзяліў муху верабейка?

- Што шчабяталі верабейкавы сябры?

- Пра верабейчыка складзена шмат вершыкаў і нават ёсць вершаваная казка.
- Паслухайце яе.
- Называецца казка "Галінка і верабей".
- Напісаў гэтую казку беларускі пісьменнік М. Танк.

***Галінка і верабей***

- Галінка-вярбінка, -

Прасіў верабей, --

Мо пакалыхала б,

Маіх ты дзяцей?

Галінка не хоча

Дзяцей калыхаць.

- Ідзіце, казулі,

Галінку ламаць!

Казулі не хочуць.

- Ідзіце, ваўкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лавіце, караці

Казуляў такіх,

Якія не хочуць,

Галінку ламаць,

Якая не хоча

Дзяцей калыхаць.

Ваўкі не схацелі.

- Прыходзьце стральцы,

Каб непаслухмяных

Ваўкоў правучыць,

Якія не хочуць

Казуляў караць,

Якія ляняцца

Галінку ламаць,

Якая не хоча

Дзяцей калыхаць…

Пайшлі паляўнічыя

У лес на ваўкоў:

Спалохана зверы

Пабеглі з дуброў,

Пабеглі казуляў лавіць і караць;

Казулі пабеглі

Галінку ламаць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галінка ж вярбінка

Са страху хутчэй

Давай калыхаць

Вераб'іных дзяцей.

З тых дзён без спачынку,

Каб кожны быў рад,

Калыша галінка

Малых птушанят.

*М.Танк*

- Пра каго гэтая казачка?

- Аб чым папрасіў верабейка галінку?

- Ці захацела галінка адразу калыхаць вераб'ёвых дзетак?

- Калі згадзілася галінка пакалыхаць дзетак вераб'я?

- Давайце  раскажам канец казкі. Паслухайце спачатку, як раскажу я.

З тых дзён без спачынку,

Каб кожны быў рад,

Калыша галінка

Малых птушанят.

- А зараз раскажыце вы.

Расказваюць 3-4 дзіцяці.

## Тэма . Восень у садзе

**Завучванне верша І. Муравейка "Восенню ў садзе**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, суадносіць яго з рэальнымі восеньскімі прыкметамі, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць.

*Матэрыял:* карцінка “ У садзе восенню”, ваза з яблыкамі.

Ход

- Паглядзіце на гэтую вазу, якая накрыта сурветкай.

- Як вы думаеце, што ў ёй ляжыць?

- Вам дапаможа здагадацца вось гэтая загадка. Калі яе адгадаеце, то даведаецеся, што ляжыць у вазе.

Румяны Піліп да палкі прыліп.

Яблык.

- Паглядзіце, і праўда ў вазе ляжаць яблыкі.

- Раскажыце пра яблыкі, якія ляжаць у вазе.

- Якія яны па колеры, смаку, вялічыні, форме?

- Калі паспяваваюць такія сакавітыя, духмяныя яблыкі?

- Як збіраюць яблыкі ў фруктовым садзе?

- Ці спрабавалі вы дастаць самастойна яблык з яблынькі ?

- Калі спрабавалі, то як вы гэта рабілі?

- Паслухайце, як збірае яблыкі ў садзе Фадзей.

**Фадзей чакае**

Ляжыць у садзе дзень Фадзей

На зайдрасць гультаям:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чакае ён, калі ўпадзе

З галіны яблык сам.

*І. Муравейка*

- Ці будзеце вы ляжаць у садзе цэлы дзень і чакаць пакуль вам ў рукі ўпадзе яблык?

- Як вы будзеце збіраць яблыкі ў садзе вы, калі станеце дарослымі?( папросіце ў ветрыка, будзеце чакаць, пакуль самі пападаюць, ці будзеце здымаць яблыкі з дрэва з дапамогай спецыяльнага прыстасавання.)

- Паслухайце верш І. Муравейка "Восенню ў садзе".

**Восенню ў садзе**

На галіне тонкай

Яблыкі вісяць.

І гадае хлопчык:

-- Як жа іх дастаць?

Выручыў малога

Вецер палявы,

Страсянуў галіну

І гукнуў:

-- Лаві!..

*І. Муравейка*

- На чым вісяць яблыкі ў фруктовым садзе?

- Аб чым гадае хлопчык?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Хто дапамог хлопчыку дастаць яблык? Хто яго выручыў?

- Што зрабіў ветрык?

- Паўтары Міхасік, што гукнуў ветрык, каб усе дзеткі гэта пачулі? Цяпер ты, Марынка . *( вызваць 2-3 дзетак*)

- Паслухайце верш "Восень у садзе" яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць.

Расказваюць 4-5 дзетак.

## Тэма. Восень у лесе

### Завучванне верша Я. Купалы «Лістапад»

*Праграмны змест*: развіваць вобразнасць маўлення, разуменне значэння вобразных слоў; практыкаваць у падборы азначэнняў да заданага слова. Падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць верш напамяць, Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні верша.

Ход

- Якая цяпер пара года?

- Назавіце прыкметы восені.

- Як называецца апошні месяц восені?

- Чаму ёе так называецца?

- Паслухайце як расказвае пра лістапад у сваім вершы Я. Купала.

**Лістапад**

З буйных ліп і бяроз

Лісты валяцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Між павалаў і лоз

Рассыпаюцца.

Шапацяць, шалясцяць

Залацістыя,

Увысь галінкі глядзяць

Пусталістыя.

А як прыйдзе вясна –

Усё адменіцца,

І галінкі ізноў

Зазеленяцца.

*Я. Купала*

- Раскажыце словамі з верша з якіх дрэў ападаюць лісты?
- Лісты буйных ліп і бяроз не проста валяцца на зямлю, яны між павалаў і лоз … і пры гэтым яны ... і ... . ( педагог сваёй інтанацыяй запрашае дзяцей да адказу).
- Якога колеру валяцца лісты з буйных ліп і бяроз?
- Якога яшчэ колеру бываюць лісты на дрэвах увосень?( *залацістыя, барвовыя, жоўтыя, карычневыя, чырвоныя)*
- Якімі застаюцца галінкі на ліпах і бярозах?
- Раскажыце пра іх словамі з верша.
- Што стане з галінкамі, калі прыйдзе вясна?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паўтарыце  яшчэ раз: “ А як прыйдзе вясна ... .

- Які настрой у вас вызывае расказванне гэтага верша? Чаму?

- Паслухайце гэты верш яшчэ раз, будзем вучыццца расказваць яго напамяць.

Расказваюць верш 4-5 дзяцей.

## Тэма. Мая сям’я

**Расказванне  верша Р. Барадуліна “Ай, Не буду! Не хачу!”**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш,  разумець змест вершаванага тэксту, асэнсоўваць учынкі персанажаў, суадносіць іх з учынкамі дзяцей у групе дзіцячага сада. Пабуджаць дзяцей да звязнага выказвання з уласнага вопыту, сумеснага расказвання верша па ролях.

Ход

- Раскажыце пра сваю сям’ю.Якая ў вас сям’я?
- Ці ёсць у вас сястрычкі.
- Як іх завуць.

- Паслухайце верш пра сястрычак, якія ёсць ў дзяўчынкі Ланы.

- Напісаў яго Р. Барадулін,  называецца верш “Ай, Не буду! Не хачу!”

**Ай, Не буду! Не хачу!**

Ёсць у Ланы тры сястрычкі:

Ай, Не буду! Не хачу!

За сястрычкамі благімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кожнай раніцай сачу.

Будзяць Лану:

- Уставай!
- А сястрычка цягне:
- Ай!
- Ланачка, памый пасуду.

А сястрычка зноў:

- Не буду!

Узяла сястрычак Лана

У дзіцячы сад з сабой.

На пацешных хочуць глянуць

Дзеці ўсе наперабой.

Цацкі лепшыя свае

Кожны пагуляць дае.

Просяць:

- Ляльку палюляй.

Ды бурчыць сястрычка

- Ай!
- Прынясі вады верблюду.

А сястрычка ім:

- Не буду!
- Мішкам дай па калачу.

А сястрычка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Не хачу!

І сказалі дзеці Лане:

- Хто дружыць з такімі стане?

Хай капрызныя сястрычкі

Кепскія забудуць звычкі

І тады ідуць у сад,

А пакуль—

Вядзі назад!

*Р. Барадулін*

- Як завуць сястрычак дзяўчынкі Ланы?

- Ці спадабаліся вам сястрычкі Ланы? Чаму?

- Раскажыце словамі з верша , што сказалі дзеці Лане пра яе сястрычак?

І сказалі дзеці Лане:

- Хто дружыць з такімі стане?

Хай капрызныя сястрычкі

Кепскія забудуць звычкі

І тады ідуць у сад,

А пакуль—

Вядзі назад!

- Ці сапраўдныя гэта сястрычкі?

- На самой справе сама Лана капрызуля. Гэта яна на ўсе просьбы адказвае трыма словамі: Ай, Не буду! Не хачу! Лепш ёй забыць пра гэтыя кепскія звычкі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Калі б у вас паявіліся такія сястрычкі, штоб вы зрабілі?

- Давайце расказам яшчэ раз гэты верш.

- Я буду расказваць верш , а Марынка, Танечка і Юля будуць мне дапамагаць.Яны будуць выконваць ролі сястрычак Ланы. Марынка, будзе сястрычкай “Ай”; Танечка, сясрычкай “Не буду” і Юля, сястрычкай “Не хачу”.

- Дзяўчынкі, назавіце сябе так, як вас завуць у вершы.

- А цяпер будзем разам верш расказваць (*у час расказвання педагог рухам рукі паказвае дзіцяці яго ўключэнне ў расказванне).*

## Тэма Зіма

**Чытанне вершаў Я. Коласа “Зіма”, Я. Купалы “ У зімовым лесе”.**

**Завучванне напамяць верша Я. Коласа “ Дзед-госць”**

*Праграмны змест*: замацаваць веды дзяцей аб прыкметах зімы, вызваць эмацыяльнальна водгук на карціны зімовай прыроды, жаданне выразіць свае ўяўленні ад паэтычнага апісання зімовых пейзажаў ў вобразным слове. Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у дашкольнікаў выразнасць голасу пры чытанні верша.

*Матэрыял*: ілюстрацыі зімовых пейзажаў

Ход

- Паглядзіце на гэтыя пейзажы. Якая пара года на іх адлюстравана?
- Што вам падказала, што гэта зіма?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Здагадайцеся, якую пару года апісвае Я. Колас у сваім вершы? Дайце назву гэтаму вершу.

**Зіма**

Надышлі марозы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Шэранем убралі.

Замялі дарогі
Ветрыкі снягамі.
Лес, як дзед, убогі
З доўгімі вусамі.

Апусціў галіны
І стаіць журботна,
Зрэдку верхавіны
Зашумяць маркотна.

Мяккая пярына
Вочы адбірае.
Белая раўніна –
Ні канца ні краю.
Пад пялёнкай белай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Травы і лісточкі.

Рэчка анямела,

Змоўклі ручаёчкі.

Амярцвелі лозы,

Чуць галлём хістаюць.

А ў палях марозы ды вятры гуляюць.

*Я. Колас*

- Пералічыце  зімовыя прыкметы, пра якія вы пачулі ў вершы.( надышлі марозы, рэчкі пад лёдам, бярозы ў шэрані, дарогі замяло снегам, травы і лісточкі пад пялёнкай белай -- пад снегам).

- У вершы паэт піша, што рэчка амярцвела, змоўклі ручаёчкі. Чаму? Што з імі стала?

- Я. Колас параўновае зімовы лес  са старым дзедам з доўгімі вусамі. Доўгія вусы гэтага дзеду гэта галінкі дрэў, пакрытыя снегам.

Апусціў галіны

І стаіць журботна,

Зрэдку верхавіны

Зашумяць маркотна.

Мяккая пярына

Вочы адбірае.

Белая раўніна –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ні канца ні краю.

- Паслухайце яшчэ адзін верш пра зімовы лес.  Напісаў гэты верш Я. Купала.

**У зімовым лесе**

І лягла  ж цішына

У бары за гарой,--

Каб дравінка адна

Хоць кіўнудла сабой.

Снег пушаны залёг

На галінах сасон,

І чарнобель, і мох

Атуліў сабой ён...

*Янка Купала*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Як апісвае зімовы лес Я. Купала ў сваім вершы?

- Дзе залёг пушаны снег?

- Што ён атуліў сабой?

- Паэт гаворыць пра снег, што ён пушаны ( пушысты), а якім яшчэ бывае снег?

- Зіма гэта не толькі белы снег, але яшчэ і моцны мароз, і …*пералічыце іншыя зімовыя прыкметы* .

- Узімку  да нас у госці заўжды прыходзіць Дзед … -- Мароз.

- Вядомы пісьменнік Я. Колас напісаў пра яго верш, і назваў яго  «Дзед-госць»?

- Паслухайце гэты верш.

**Дзед- госць**

Ходзіць дзед белабароды

Полем, лесам, пералескам,

Засцілае рэчкі лёдам,

Брыльянцістым снежным блескам.

Сыпле іней на бярозы,

Туліць дрэвы лёгкім пухам,

Крые руні, травы, лозы

Белай воўнаю — кажухам.

*Я. Колас*

- Як вы лічыце, чаму ў гэтага верша такая назва -- « Дзед-госць»?

- Пералічыце словамі з верша, якія справы ў белабародага дзеда ўзімку?( засцілае рэчкі лёдам, сыпле іней на бярозы, туліць дрэвы лёгкім пухам, пакрывае травы, лозы белай воўнаю – кажухам).

- З чым параўноўваецца снег у вершах пра зіму? ( з белай воўнаю – кажухам, з белаю плёнкай, з мяккай пярынай).

- З чым бы параўналі снег вы, калі б складалі пра яго верш?

- Паслухайце гэты верш яшчэ раз.

- Будзем расказваць яго напамяць.

( расказваюць 4-5 дзяцей)

**Завучванне верша Я. Коласа “На рэчцы зімою”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне адчуваць і разумець характар вобразаў паэтычных твораў, засвайваць паслядоўнасць развіцця сюжэта, заўважаць выразна-выяўленчыя сродкі. Падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна расказваць урывак з верша напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні верша па ролях.

Ход

- Назавіце вашы любімыя зімовыя гульні ?
- Узімку рэчка замярзае . І дзеці , і дарослыя могуць катацца па лёдзе на каньках.

- Паслухайце верш , які называецца "На рэчцы зімой", напісаў яго Я. Колас.

**На рэчцы зімой**

Не сядзіцца ў хаце

Хлопчыку маލому:

Кліча яго рэчка,

Цягнуць санкі з дому...

-- Мамачка-галубка! –

Просіць ён так міла.—

Можа б ты на рэчку

Пагуляць пусціла?

Я не буду доўга,

Зараз жа вярнуся,

Трошачкі на рэчцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У санках паважуся.

-- Ну, ідзі пабегай,

Толькі апраніся

Ды, глядзі, ў палонку,

Сынку, не ўваліся.

Радасць і раздолле

Хлопчыку малому,

І не пазайдросціць

Ён цяпер нікому!

*Я. Колас*

- Пра якую пару года ідзе размова ў вершы?

- Куды просіцца хлопчык у маці?

- Раскажыце словамі з верша, як хлопчык просіцца ў маці на рэчку.

Мамачка-галубка! –

Можа б ты на рэчку

Пагуляць пусціла?

Я не буду доўга,

Зараз жа вярнуся,

Трошачкі на рэчцы

У санках паважуся.

- Раскажы ты Міколка, але расказвай так, каб адчувалася твая пяшчота і любоў да маці.

- Раскажы ты, Вадзік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Аб чым папярэджвае маці хлопчыка?

- Паслухайце яшчэ раз яе папярэджванне.

- Цяпер раскажы ты Маша, аб чым папярэджвае маці хлопчыка.

Ну, ідзі пабегай,

Толькі апраніся

Ды, глядзі, ў палонку,

Сынку, не ўваліся.

- Хто яшчэ з вас хоча расказаць , як маці папярэджвае малога хлопчыка.

- Давайце раскажам увесь верш разам па ролях.

- Хто з вас хоча быць хлопчыкам, хто – маці. Так, а я буду чытаць гэты верш за аўтара.

- Паслухайце яшчэ раз гэты верш цалкам.

- Цяпер будзем расказваць яго па ролях.

## Тэма Мая сям'я

### Расказванне верша С. Новіка-Пяюна” Над калыскай”

*Праграмны змест:* развіваць уменне дзяцей адчуваць мілагучнасць, рытмічнасць мовы верша, перадаваць свае адносіны да зместа вершаванага тэксту. Развіваць у выхаванцаў уменне вызначаць словы, якія вымаўляюцца ласкава і пяшчотна.Заахвочваць дзяцей да расказвання з ласкай і пяшчотай першага радка верша.

Ход

- Ці спяваюць вам калыханкі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Якія калыханкі вы ведаеце?
- Паслухайце калыханку, якую напісаў С. Новік – Пяюн. Называецца яна «Над калыскай».

**Над калыскай**

Запаліла ночка
Зорныя агні,
Спі, мая дачушка,
Любая, засні.

Над тваёй калыскай
Буду я пяяць,
Пра ката і мышку
Казачку казаць.

Пад акенцам кветачка
Цудная цвіце.
Мая крошка-дзетачка
З дня на дзень расце.

Вунь высока зорачка
Золатам блішчыць,
А мая дачушка
Штосьці ўсё сніць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З-за хмурынкі месячык

Беленькі ідзе,

За сабою зорачак

Карагод вядзе.

*С. Новік –Пяюн*

- Каму спявае маці калыханку?

- Што абяцае матуля сваёй дачушцы?

- Яна гаворыць, што над яе калыскай будзе пяяць, пра ката і мышку; казачку казаць, каб дачушка з дня на дзень хутчэй расла.

- Як спявае маці калыханку?

- Назавіце словы, якія спяваюцца ў калыханцы з ласкай і пяшчотай.

- Паспрабуйце расказаць першы радок калыханкі з ласкай і пяшчотай.

Запаліла ночка

Зорныя агні,

Спі, мая дачушка,

Любая, засні.

Расказваюць 4-5 дзяцей.

## Тэма . Вясна

**Чытанне верша Я. Коласа “ Уцякай Мароз дзядуля”.**

**Завучванне верша Я. Коласа “Вясна”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў, суадносіць змены, якія адбываюцца ў прыродзе з прыкметамі вясны, апісанымі ў вершы, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Падтрымліваць у дашкольнікаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць па парах, па аднаму, па чарзе.

*Матэрыял:* ілюстрацыі па тэме “Вясна”

Ход

- Якія прыкметы вясны вы заўважылі сёння, калі ішлі ў дзіцячы садок.

- Ідзе вясна, ідзе, абуджае лугі, палі – усё наваколле. Дарослыя і дзеці спяваюць песні вясне. Прыгожы верш пра вясну напісаў вядомы беларускі паэт Я. Колас.

**Песня аб вясне**

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках – булі-гулі! –
Песні чуюцца вясне.
Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк.
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.
А ён, гучны і смяшлівы,
Так і ходзіць, аж дрыжыць,
І другі сябрук шчаслівы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Насустрэч яму бяжыць.

А зіма аж пачарнела –

Годзе ёй тут кросны ткаць!..

Гэй, маленства, жыва, смела

Выйдзем весну прывітаць!

*Я. Колас*

- Якія песні чуюцца вясне?

- Як спявае вясне песню жэўжык-ручаёк?

- Пад чыім позіркам жэўжык-ручаёк звоніць, скача, як дзіцятка?

- Як апісвае паэт ручаёк? Які ён?

- Што стала з зімой?

- Паслухайце, як расказвае Якуб Колас  пра змены ў акаляючай прыродзе яшчэ ў адным вершы.

**Вясна**

...Сонца грэе, прыпякае;

Лёд на рэчцы затрашчаў,

Цёплы вецер павявае,

Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

Вось і бусел паказаўся,

Гусі дзікія крычаць,

Шпак на дубе расспяваўся,

Жураўлі ужо ляцяць...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Якуб Колас*

- Пералічыце прыкметы вясны, пра якія расказваецца ў вершы.
- Як свеціць сонца?
- Што стала з лёдам?
- Які стаў ветрык і што ён нам прыгнаў?
- Як птушкі сустракаюць вясну?
- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго з вамі расказваць напамяць.
- Будзеце расказваць па двое. Адзін раскажа пра змены, якія адбываюцца ў прыродзе :

...Сонца грэе, прыпякае;
Лёд на рэчцы затрашчаў,
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

- Другі – пра птушак:

Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія крычаць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ужо ляцяць...

- Слухайце верш уважліва яшчэ раз.
- Першымі раскажуць верш Натуся і Міхасёк. Калі ласка, Натуся пра змены ў прыродзе, а Міхасёк пра птушак.
- А цяпер раскажам верш цалкам. ( 2-3 дзіцяці)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Малайцы, давайце паспрабуем расказаць гэты верш па чарзе. Кожны з вас будзе гаварыць па адной вясновай прыкмеце, па чарзе. Адзін пачынае : "...Сонца грэе, прыпякае", другі працягвае –"Лёд на рэчцы затрашчаў" і г.д.

**Завучванне верша А. Дзеружынскага "Пралеска"**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вобразную мову верша, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Падтрымліваць у іх жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў вобразнасць маўлення, заахвочваць іх да драматызацыі вершаваных радкоў.

*Матэрыял:* букет пралесак

Ход

- Паглядзіце на гэты вясновы букецік? Якія кветкі ў гэтым букеце?
- Назавіце першыя вясновыя кветкі.
- Паслухайце вершык пра пралеску.

**Пралеска**

Прыгрэла сонейка

На ўзлеску,

Птушыны спеў

Чуваць здалля...

Стаіць

І слухае пралеска,

Як ціха

Дыхае зямля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*А Дзеружынскі*

- Як расказваецца ў вершы пра вясновую прыроду?

- Што стаіць і слухае пралеска?

- Хто з вас жадае расказаць пра паяўленне першай вясновай кветкі – пралескі словамі з верша?

- Цяпер паслухайце, як пра нараджэнне пралескі расказвае ў сваім вершы В. Вярба.

**Пралеска**

Белыя бярозы
Спалі на ўзлеску,
Як сваю галоўку
Узняла пралеска.
Тоненькую ножку
З-пад пярыны белай
На зямлю пралеска
Ставіла нясмела.
А снягі наўкола –
Ні канца, ні краю,
Страшна стала кветцы:
“Я адна – жывая!”
Кажа зверху сонца:
“Зорачка лясная,
З новым нараджэннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я цябе вітаю!”

Белыя бярозы

Разам зашапталі:

“Мы цябе, пралеска,

Ўсю зіму чакалі”

І старая елка

Галасна ўздыхнула:

“Вясна надыходзіць,

А зіма мінула”.

*В. Вярба*

- Раскажыце словамі з верша, як паявілася пралеска з-пад пярыны белай?

- Як назвала пралеску сонейка?

- Давайце паспрабуем расказаць верш разам. Я буду чытаць верш, Надзейка будзе пралескай, Уладзік – сонейкам, Марыся і Кацярынка – бярозкамі, А Волечка – елкай.

- Надзейка, паспрабуй сказаць свае словы з пяшчотай:“Я адна – жывая!”

- Уладзік, павітай пралеску радасна :“Зорачка лясная, з новым нараджэннем я цябе вітаю!”.

- Марыся і Кацярынка, скажыце ціха і разам з замілаваннем:“Мы цябе, пралеска, усю зіму чакалі”.

- Волечка, паспрабуй сказаць громка, прывітальна:“Вясна надыходзіць,А зіма мінула”.

- Паслухайце верш, будзем расказваць яго разам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- А цяпер зноў размяркуем ролі і раскажам гэты верш разам з іншымі дзяцьмі.

## Тэма .У лесе летам

### Завучванне верша А. Прохарава «Мурашыная святліца»

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Пабуджаць дзяцей да звязных выказванняў з уласнага вопыту. Падтрымліваць у іх жаданне самастойна чытаць верш напамяць.

*Матэрыл:*мурашнік і мурашы

Ход

- Паглядзіце на малюнак, хто гэта?
- Дзе вы бачылі мурашоў?
- Ці назіралі вы, дзе жывуць мурашы?
- Паслухайце верш пра мурашыны дом.

**Мурашыная святліца**

Пад ялінаю ў цішы

Дом узводзяць мурашы.

Без радлёўкі і сякеры –

Ім не трэба вокны, дзверы.

На вачах расце з ігліцы

Мурашыная святліца.

Цёплым сонцам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І смалою

Пахнуць новыя пакоі.

*А. Прохараў*

- Ці падобны дом мурашоў на дом , у якім жывуць людзі?
- Чым мурашыная святліца адрозніваецца ад нашых дамоў?
- Ці аднолькавы матэрыял з якога будуюць дом мурашы і людзі?
- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць.

Расказваюць 3-4 дзіцяці.

## Тэма. Мая сям'я.

### Завучванне верша С. Сокалава-Воюша «Возера лясное"

*Праграмны змест:* заахвочваць дзяцей да састаўлення апавяданняў з асабістага вопыту, падтрымліваць у іх жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні верша.

*Матэрыял*:фотаальбом сям'і

Ход

- Як адпачывае ваша сям'я?
- Дзе вы адпачывалі летам?
- Раскажыце пра свой летні адпачынак?
  - Ці бачылі вы калі-небудзь лясное возера?
  - Што вы рабілі на лясным возеры разам з бацькамі?
  - Ці варылі вашы бацькі варголы, каб потым усім разам піць гарбату.
- Паслухайце верш, пра летні адпачынак хлопчыка каля ляснога возера.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Возера лясное**

Возера лясное,

Вогнішча на выспе.

Варацца варголы

У вялікай місцы.

Варацца варголы

Булькаюць вясёла:

Будзем піць гарбату

Мама , я і тата.

*С. Сокалаў-Воюш*

- Хто з вас адпачываў на лясным возеры так, як гэты хлопчык?

- Што было інакш?

- Раскажыце, як адпачываў каля ляснога возера маленькі хлопчык.

- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем расказваць яго напамяць

Расказваюць 3-4 дзіцяці.

## Тэма. Звяры

**Завучванне верша Л. Геніюш "Зубры"**

*Праграмны змест:* замацаваць веды дзяцей пра звяроў нашых лясоў, падтрымліваць у іх жаданне самастойна расказваць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні верша.

*Матэрыял*:малюнкі " Зубры", дзікія звяры

Ход

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- У нашай краіне шмат лясоў. Самы вялікі лес—Белавежская пушча. У Белавежскай пушчы жывуць розныя звяры .

- Назавіце звяроў, якія жывуць у Белавежскай пушчы. Паглядзіце, вось яны на малюнку.

- Самы магутны звер, які жыве ў  Белавежскай пушчы – зубр. Ён валадар пушчы.

- Паглядзіце на гэты малюнак і раскажыце, як выглядае зубр?

-Паслухайце, як расказваецца пра гэтых магутных звяроў у вершы Л. Геніюш «Зубры».

**Зубры**

Белавежаю крочаць зубры,
Пушчы слаўнае валадары.
І гарбы ў іх крутыя, і рогі,
Саступаюць усе ім з дарогі:
І мядзведзі, і злыя ваўкі
Зразу кідаюцца ў бакі.
Толькі зайчык адзін не баіцца,
Скача, скача ля светлай крыніцы.

*Л. Геніюш*

- Кім з’яўляюцца зубры ў пушчы?
- Як выглядаюць зубры?
- Хто баіцца зуброў? Як пра гэта гаворыцца ў вершы?
- Хто не баіцца зуброў? Як пра гэта гаворыцца ў вершы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паслухайце верш яшчэ раз. Будзем расказваць яго з вамі напамяць.
- Расказваюць 4-5 дзетак.

## Тэма. Маміна свята.

### Чытанне верша Р. Барадуліна “ Ната маму любіць надта”

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, разумець змест вершаванага тэксту, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Папоўніць слоўнікавы запас выхаванцаў эмацыянальна-ацэначнай лексікай. Заахвочваць іх да выражэння ў звязным выказванні сваіх адносін да прачытанага .

*Матэрыял*:фотаздымкі матуль дзяцей з групы

Ход

- У кожнага з вас ёсць мама. Яна любіць вас, даглядае, гуляе з вамі.
- Ці любіце вы сваю родную матулю?
- Якія ласкавыя словы вы гаворыце сваёй матулі?
- Чым вы ёй дапамагаеце?
- Паслухайце верш Р. Барадуліна пра дзяўчынку Нату, якая маму любіць надта.

**Ната маму любіць надта**

Мама мые раму,

Ходзіць мама ў краму.

І ў дачушкі Наты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Цэлы дзень заняты:

То шукае

маму,

То гукае

маму:

Мама,

дзе піжама?

Мама,

дзе панама?

Мама,

дзе праграма?

Мама.

Мама.

Мама.

Ледзь прачнецца Ната,

Шуму поўна хата,

Поўна шуму, гаму,

Бо дачушка Ната

Надта

Любіць маму!

*Р. Барадулін*

- Ці сапраўды дачушка Ната любіць сваю маму?

- Раскажыце , чаму вы лічыце, што Ната не надта любіць сваю маму?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Якімі словамі можна расказаць пра Нату? Якая яна?

- Як вы паказваеце сваю любоў да роднай матулі?

- Што гавораць пра тых дзетак, якія дапамагаюць сваёй маці? Якія гэтыя дзеткі?

- Раскажыце пра сваю  матулю, як вы любіце, чым вы ёй дапамагаеце.

## Тэма. Мая сям'я

**Чытанне верша Л. Геніюш "Унукі", В. Вярбы " Бабуліны казкі"**

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы,  разумець змест вершаваных тэкстаў, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Развіваць у выхаванцаў  навыкі звязнага маўлення. Выхоўваць любоў і павагу да бабулі і дзядулі.

*Матэрыял:*фотаздымкі бабуль і дзядуль дзяцей групы.

Ход

- У кожнага з вас ёсць дзядулі і бабулі. А вы – іх унукі.

- Вы ездзіце  або ходзіце да сваіх бабуль і дзядуль у госці.

- Якія падарункі вы ім прыносіце?

- Паслухайце верш Л. Геніюш "Унукі"

**Унукі .**

Доўга . доўга бег цягнік,
Покуль не спыніўся
Ён марудзіць не прывык,
Вось і замарыўся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І прыехалі да дзедкі

Унукі – малышы ў адведкі.

Глянцам ззяюць клункі –

Гэта падарункі:

Дзеду – акуляры

У дарагім футляры

Бабулі—хусцінку, --

Вясёлкі часцінку.

Дзед вітае:

- Мае дзеткі!

І бабуля:

- Мае кветкі!

І Тарзанчык: “Гаў-гаў-гаў!”

І кот Мурзік: “Мяў-мяў-мяў!”

Унукі цешацца і скачуць,

А бабуля з дзедам плачуць.

- Гэта з радасці , унукі,

Пасля доўгае разлукі.

*Л. Геніюш*

- Што ўнукі прывезлі ў падарунак бабулі і дзеду.

- Як віталі ўнукаў дзед, бабуля, сабачка Тарзанчык і кот Мурзік.?

- Раскажыце пра сваю бабулю: якая яна, чым любіць займацца, як з вамі гуляе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паслухайце , як расказваецца пра бабулю ў вершы В. Вярбы “Бабуліны казкі”

**Бабуліны казкі**

У бабулі маёй
Рукі лоўкія,
У бабулі маёй
Песні доўгія.

Разматае клубок
З новай казкаю,
Прыйдзе хітры каток,
Трэцца з ласкаю.

Хоча лапкі пагрэць,
Завуркоча ён,
Ні гуляць, ні дурэць
Нам не хочацца.

Вось і дзень праляцеў,
І не спіцца нам.
Бабка казкі пляце,
Чараўніцаю.

*В. Вярба*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Раскажыце, ці падобна гэтая бабуля на вашых бабуль?
- Якая ваша бабуля?

## Тэма. Радзіма

**Чытанне верша А. Вольскага “Радзіма”**

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць верш, выхоўваць у іх гонар за сваю Радзіму, любоў да яе. Заахвочваць выхаванцаў да дагаворвання асобных слоў у вершы, развіваць навыкі звязнага маўлення.

*Матэрыял*:фотаздымкі знакамітых месцаў Беларусі.

Ход

- Назавіце сваю Радзіму.
- Раскажыце, якая наша Беларусь?
- Паслухайце , як расказвае пра Беларусь у вершы А. Вольскі. Называецца верш “Радзіма”.

**Радзіма**

Радзіма ў нас—

бязмежная,

Спякотная

і снежная .

Радзіма ў нас—

цудоўная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

багаццяў розных поўная.

Радзіма ў нас –

магутная

і ва ўсім свеце

чутная.

Радзіма ў нас—

лагодная,

нібы матуля родная.

А самае

галоўнае :

усе ёй дзеці –

роўныя.

*А. Вольскі.*

- Як вы разумеце выраз, што Радзіма ў нас бязмежная?

- Чаму пра нашу Радзіму гаворыцца, што яна спякотная і снежная?

- У нетрах нашай Радзімы есць калійная соль, нафта; на заводах Беларусі вырабляюць магутныя Мазы і трактары “Беларусь”. Раскажыце, як пра гэта гаворыцца ў вершы?

- Пра нашу Радзіму ведаюць ва усім свеце. Праслаўляюць нашу радзіму простыя людзі вырабамі сваёй працы, вядомыя арцісты, спартсмены. Менавіта таму ў вершы гаворыцца, што наша Радзіма ва ўсім свеце .. . *чутная.*

- Як адносіцца да вас матуля?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Радзіма, як і матуля, адносіцца да ўсіх людзей з любоўю, клопатам.

Таму ў вершы і гаворыцца, што Радзіма ў нас — лагодная, нібы матуля родная.

Усе дзеці ў нашай Радзіме – роўныя.

- Раскажам разам словамі з верша, якая ў нас Радзіма.

Радзіма ў нас—
... бязмежная,
Спякотная
І ... снежная .
Радзіма ў нас—
... цудоўная.
багаццяў розных ... поўная.
Радзіма ў нас –
... магутная
і ва ўсім свеце
... чутная.
Радзіма ў нас—
... лагодная,
нібы матуля ...родная.
А самае
галоўнае :
усе ёй дзеці –
... роўныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Мы жывем ў прыгожай і цудоўнай краіне – Беларусі. Усе дзеці ў нашай краіне маюць роўныя правы.
- Раскажыце, якую назву мае наша Радзіма, як завуць людзей, якія ў ёй жывуць, на якой мове яны размаўляюць.

## Тэма. Птушкі

### Завучванне верша А. Дзеружынскага “ Бусел і хлопчык”

*Праграмны змест:* падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры драматызацыі верша, інтанацыйнаую разнастайнасць перадачы тэксту ў залежнасці ад яго зместу.

*Матэрыял:* малюнак бусліка

Ход

Паказаць малюнак , на якім адлюстраваны буслік.

- Як завецца гэтая птушка?
- Якія прыкметы птушкі падказалі вам, што гэта буслік?
- Ці застаецца бусел ў нашай краіне на зіму?
- Паслухайце размову бусла і хлопчыка ў вершы “ Бусел і хлопчык” А. Дзеружынскага.

**Бусел і хлопчык.**

Хлопчык: Бусел, бусел, клёка-клёка,
Дзе ты жыў?

Бусел: Я жыў далёка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

За гарамі, за лясамі,

Там, дзе Ніл, на поўдні самым.

Хлопчык: Што за Ніл?

Бусел: Рака такая,

Быццам мора гаманкая.

А ў тым Ніле, хлопча мілы,

Ёсць страшыдлы-кракадзілы.

Хлопчык: Як жа ты там, буслу, жыў?

Бусел: Я не жыў, усё тужыў.

Дзе б ні быў, дзе б ні лятаў,

Родны край успамінаў.

*А Дзеружынскі*

- Аб чым пытаецца хлопчык у бусла?

- Што адказвае хлопчыку бусел?

- Як бусел расказвае пра сваю тугу па Радзіме? Раскажыце пра гэта словамі з верша.

- Дзе б ні быў, дзе б ні лятаў,

Родны край успамінаў.

- Давайце раскажам верш разам, я буду Буслікам, а хто-небудзь з вас – хлопчыкам.

-Паслухайце верш.

- Цяпер будзем яго расказваць .

( расказваецца разам з 2-3 рознымі дзецьмі)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Расказванне верша па ролях дзецьмі самастойна. (2-3 разы)

## Тэма . Вясёлыя вершы

**Знаёмства дзетак з гумарыстычнымі вершамі «Шалтай-балтай» І. Муравейкі , «Гаспадарка» З. Бядулі**

*Праграмны змест:* працягваць развіваць у дзяцей уменне разумець змест вершаў, іх гумарыстычны сэнс і недакладнасці. Развіваць навыкі звязнага маўлення.

Ход

- Ці ведаеце вы, хто такі Шалтай-Балтай?

- Паслухайце, як пра яго расказвае ў сваім вершы І. Муравейка. Верш называецца

“ Шалтай-Балтай”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Шалтай-Балтай**

Шалтай-Балтай
Па вёсцы блукаў,
Шалтай-Балтай
Работу шукаў.

Цэлы дзень шукаў,
Не губляў мінуты.
Змарнеў, схуднеў
І праспаў сем сутак.

*І. Муравейка*

- Цяпер вы ведаеце, хто такі “Шалтай-Балтай”?

- Аб чым расказваецца ў гэтым вершы, што  на самой справе не бывае?

- Паслухайце яшчэ адзін верш.

**Гаспадарка**

У куце сядзіць мядзведзь
Хустку вышывае,
А лісічка-невялічка
Хатку прыбірае.

А каток пячэ аладкі,
Маслам залівае,
На тапчане мышанятка
Есці памагае.

А сабачка ўе вяроўкі –
Пугу для хлапчыны,
Дзяцел-бондар на начоўкі
Длубае асіну.

Казёл лапці папраўляе,
Скуратом мацуе,
На акенцы павучочак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кросенцы рыхтуе.

*Зм. Бядуля*

- Ці бывае тое, пра што гаворыцца ў вершы ў сапраўдным жыцці?
- Што ў гэтым вершы не так?
- Якія недарэчнасці вы заўважылі ў гэтым вершы?

## Тэма. Мае сябры

**Расказванне верша В. Іпатавай Я. Запытанка.**

*Праграмны змест*: даць уяўленне дзеткам аб жанры верша, развіваць цікавасць да паэтычнага тэксту, навыкі звязнага маўлення.

Ход

- Хто такі чамучка?
- Як інакш можна назваць таго, хто задае шмат пытанняў ?
- Паслухайце верш В. Іпатавай "Янка-Запытанка".

**Янка-Запытанка**

Ледзь паснедаўшы, ад ранку
Да начы бесперастанку
Задае пытанні Янка,
Па мянушцы Запытанка.

-- Мама, а чаму, скажы,
Расце цеста ў дзяжы?
А чаму ў каровы рогі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А куды вядуць дарогі?

Ах ты, Янка,
Янка-Запытанка!

А чаму гурок зялёны?
Чаму клён завецца клёнам?
Хата дзятла на сасне?
Воўк адзін жыве ці не?

Толькі ўспомніў пра ваўка –
Скок аднекуль шэры,
І схапіў ён хлапчука:
-- Будзе мне вячэра!

Хоць прыйшла бяда такая,
Ды хлапец усё пытае:

-- Дзе ты, воўча, бок падраў?
А ці шмат у цябе спраў?
А чаму бяжыш як сонны?
А ці мыў ты вушы сёння?
Воўк ад злосці аж засоп,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

За каўнер хлапчыну згроб,

Да нары не дацягнуў,

Тут, адразу ж , праглынуў.

Ах ты, Янка,

Янка-Запытанка!

Рады, сыты, Воўк смяецца.

Толькі  што гэта – здаецца,

А ці праўда: з жывата

Янка зноў пачаў пытаць.

-- А чаму трасешся ты?

А нашто звярам хвасты?

А які тут цёмны кут?

А спяваць ці можна тут?

… Да Ваўка бягуць звяры.

Бачаць, Воўк маўчыць стары,

Сціснуў зубы, сціснуў рот,

А крычыць… крычыць жывот!

Ах ты, Янка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Янка-Запытанка!

Воўк – дадому. Ды дарма –
Там ваўчыца кажа:
-- Прэч! Якое ваўчаня
Спаць пры шуме ляжа?

І паплёўся Воўк у даль,
У абласны лясны шпіталь.
Да урача ўваліўся Воўк,
Захрыпеў, завыў і змоўк…

… Саслабелы Воўк ляжыць.
Янка сцежкаю бяжыць
Ды усё пытаецца…
А звяры хаваюцца:

Хто ў балота,
Хто ў мох,
Каб убачыць іх не мог!

Усе баяцца Янку,
Янку-Запытанку!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*В. Іпатава.*

- Твор, які я вам прачытала, гэта верш ці апавяданне?

- Чаму вы лічыце, што гэта верш?

- Так, вершы вызначаюцца рыфмай ( аднолькавыя хвосцікі на канцах слоў радкоў верша) і вершаваным рытмам.

- Чаму Янку назвалі Запытанка?

- Што здарылася з ваўком?

- Чаму ўсе звяры баяцца Янку-Запытанку?

- Ці ёсць у нашай групе хлопчыкі і дзяўчынкі падобныя на Янку?

## Тэма. Цацкі

### Расказванне вершаў “Працавітая Дзяўчынка”, “Як зроблены цацкі” , “Пра качак, шчупака і мячык Янука”

*Праграмны змест*: развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець тэкст вершаваных тэкстаў, адчуваць рытм вершаваных радкоў; навыкі звязнага маўлення. Працягваць развіваць у дзяцей уменне асэнсоўваць змест вершаў, характары персанажаў. Узбагачаць слоўнік выхванцаў эмацыянальна-ацэначнай лексікай.

Ход

- Назавіце сваі любімыя цацкі.

- Раскажыце, як вы гуляеце са сваімі цацкамі.

- Паслухайце, як расказваецца ў вершы пра тое, як гуляе са сваёй лялькай дзяўчынка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Працавітая дзяўчынка**

Як маленькую сяброўку,

Ляльку любіць Каця.

То расчэша ёй галоўку,

То памые плацце.

То пагушкае на ручках,

То пацешыць байкай –

Як у лесе ў дрымучым

Заблудзіўся зайка.

Ляльцы ловіць

матылёчка

Шапачкай сваёю,

Праз шнурочак-паясочак

Скача перад ёю.

Спаць паклаўшы паміж

кветак

У цянёк духмяны,

Ёй з пясочку шмат катлетак

Напячэ румяных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

За турботамі, за працай

Так і дзень мінае,

А самой пазабаўляцца

Часу не хапае.

*А. Александровіч*

- Чаму верш называецца “Працавітая дзяўчынка”?

- Раскажыце, як гуляе са сваёй лялькай Каця.

- Ці гуляеце так вы са сваімі лялькамі?

- Цяпер паслухайце верш, як гуляе са сваімі цацкамі Дзяніска?

**Як зроблены цацкі**

У Дзяніскі сёння свята:

Цацак дзед прынёс багата –

Верталёт і самаходку,

І пластмасавую лодку,

Матаролер і машыну

З размалёванай кабінай.

Рад Дзяніска, вельмі рад.

І паставіў цацкі ў рад.

Перш ўзяўся за машыну –

Адвінціў ураз кабіну,

Потым колы паздымаў.

Верталёт той паламаў.

Разабраў на дзіва скора

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да драбніцы матаролер.

Дзед убачыў, забубніў:

-- Што ты з цацкамі зрабіў?

Я табе іх нёс гуляць –

Хіба ж можна іх ламаць?

Не купляў бы я, каб ведаў.

А Дзяніска кажа дзеду:

-- Мне карцела разабрацца,

Як жа зроблены ўсе цацкі,

А ва ўсім як разбяруся –

Цацкі зноў складу, дзядуся!

*А. Ставер*

- Як гуляе з цацкамі Дзяніска?
- Ці добра гуляе Дзяніска са сваімі цацкамі?

- Адкажыце словамі з верша, чаму Дзяніска ў машыны адвінціў ураз кабіну, потым колы паздымаў, верталёт той паламаў, разабраў на дзіва скора да драбніцы матаролер.

- Ці хацелася вам даведацца з чаго зроблены вашы цацкі?

- Што паабяцаў дзядусю Дяніска?

- У якія гульні вы любіце гуляць?

- Паслухайце вершык пра тое, як Янук пагуляў са сваім мячыкам.

**Пра качак , шчупака і мячык Янука**

Ішоў па мосціку Янук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У рэчку мячык выпаў з рук,
-- Патоне!—
крыкнуў хлопчык,
Ад страху аж заплюшчыў вочы.
Аднак дарэмны крык
і плач:
На хвалях гушкаецца мяч.

Янук глядзіць туды, сюды –
Як мячык выручыць з бяды?
А тут ізноў бяда: на мячык

Напала трое шэрых качак,
І сталі мяч адна адной
На дзюбы кідаць над вадой.

З-пад хвалі вынырнуў
Шчупак
І носам ткнуў у мячык так,
Што мяч у неба ўзняўся
свечкай,
Бліснуў ад сонейка
над рэчкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І на здіўленне шчупаку

У рукі трапіў Януку.

*А. Александровіч*

- Чаму не патануў мячык Янука?
- Што сталі рабіць з мячыкам шэрыя качкі?
- Якім чынам мячык апынуўся ізноў у руках Янука?

- Знайдзіце у нашым групавым пакоі цацкі, пра якія расказвалася ў вершах і раскажыце, кожны пра сваю цацку, якая яна, як вы з ёй гуляеце?

## Тэма . Дзіцячы сад

### Расказванне вершаў “Наш дзень”, “Дашын карандашык”

*Праграмны змест:* развіваць у дзяцей уменне эмацыянальна ўспрымаць вершы, разумець змест вершаваных тэкстаў, адчуваць рытм вершаваных радкоў. Паглыбляць ўяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу. Развіваць у выхаванцаў выразнасць звязнага маўлення, інтанацыйнаую разнастайнасць перадачы тэксту. Заахвочваць дашкольнікаў да адлюстравання сваіх ведаў ў маляванні.

Ход

- Раскажыце пра тое, як праходзіць ваш дзень у дзіцячым садзе?

- А зараз паслухайце вершык пра тое, як дзеці праводзяць свой час ў дзіцячым садку.

**Наш дзень**

Люда,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Стась

І я – Мартын,

Мы раскажам вам аб тым,

Як жывём і дружым мы,

Як расцём мы дужымі,

Якія ў нас

паводзіны,

Ці добра час

праводзім мы.

Пачынаем дзень спачатку

Фізкультурнаю зарадкай.

Раз – налева,

Два – направа,

Крок наперад,

Крок назад.

Нават Стась маленькі

жвава

Патрапляе з намі ў лад

Ён стараецца , таму

І ўдаецца ўсё яму.

**Каб не быць слабым**

**і хмурым,**

**Не цурайся фізкультуры!**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Павярнуліся – налева,
- Павярнуліся – направа,
- Крок наперад,
- Крок назад.

Эх, як весела бруіцца,

Льецца,

булькае

вадзіца.

Возьмем шчоткі – зубы тром

Беласнежным парашком.

З мылам мы пад кранам

мыем

Рукі,

вушы,

твар

і шыю.

**Чыста мыцца –**

**наша ўмова,**

**Той, хто чысты, --**

**той здаровы .**

За сталом утрох сядзім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мы з ахвотаю ядзім.

Нам заўсёды ўсё па густу:

Каша, бульба ці капуста.

--Я не буду... не хачу я...—

Слоў такіх ты не пачуеш.

**За сталом у нас заўжды**

**Цішыня у час яды.**

Мы садоўніку старому

Пасабляем каля дому.

Сад у нас харошы:

На газонах

Мак чырвоны,

Ружы і гарошак.

Мы і дома пасабляем:

Я падлогу падмятаю,

Фартушок надзеўшы, Люда

Мые ў тазіку пасуду.

Стась сваю работу знае –

Ён вазоны палівае.

**Дзецям з працай**

**трэба знацца,**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пасабляй бацькам**

**у працы!**

Дом вялікі. На двары
Шмат гуляе дзетвары,--
Весела заўсёды.
Разам з імі, як сябры,
Мы гуляем на двары,
Водзім карагоды.

**Песня з намі**

**неразлучна.**

**Падружыся з песняй**

**гучнай!**

Кнігі мы не забываем,
Кнігі ўважліва чытаем.
Перад кнігаю раскрытай,
Хоць яшчэ не знае літар,
За сталом сядзіць і Стась.
Ён малюнкі услых чытае,
Без памылак разбірае,
Дзе шчупак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а дзе карась,

Дзе рабіна,

дзе лаза,

Дзе рагатая каза.

**Хочаш знаць, усё і ўсіх –**

**Сябрам будзь**

**цікавых кніг.**

Вечар блізіцца, якраз

І канчаецца рассказ.

Абяцанне мы стрымалі,

Пра сябе вам расказалі.

А цяпер пачуць цікава

І пра вас,

Пра вашы справы:

Гульні, дружбу і работу.

Спадзяёмся,

Вы з ахвотай

Нас, сябры, уважыце –

Пра сябе раскажаце.

*А. Александровіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Ці падобна тое, як паводзяць сябе ў дзіцячым садзе Люда, Стась і Мартын, на ваша жыццё ў дзіцячым садзе?

- Чым вы займаецеся ў дзіцячым садзе?
- Паслухайце, пра тое, чым займаецца ў дзіцячым садзе Даша?

**Дашын карандашык**

Толькі возьме наша Даша
Карандашык у руку,
Як адразу карандашык
Намалюе на лістку
І сасну, і дуб высокі,
І вярбу, і яварок,
І сароку-белабоку,
І грыбок-баравічок;
Намалюе – глянуць люба –
Матылькоў і пчолак рой;
А суніцы – хоць у кубак
Награбай сваёй рукой.
Вось які ў нашай Дашы
Чарадзейны карандашык.

*А. Александровіч.*

- Што вы малюеце на занятках і ў вольны час ?
- Ці ёсць у вас такі чарадзейны карандашык?
- Намалюйце сваім чарадзейным карандашыкам свой дзень у дзіцячым садзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ